блема конфликтов между реализацией принципа независимости в момент совершения выбора согласно с собственными вкусами и потребностями, сопряженного с необходимостью отказаться от реализации свободного выбора во имя гармонии с чужими мнениями и вкусами.

Итак, исследование показывает, что:

1. Широко распространенные стереотипы о бездушности этого поколения, его душевной черствости и безразличию ко всему, что не касается его личных интересов, не соответствуют действительности.
2. Высокая значимость афиляционно-аллоцентрических ценностей в аксиологической структуре этого поколения знаменательна и неожиданна. В молодежной среде, большая часть которой ориентирована на высокие финансовые доходы, материальное благополучие, жизненный успех (при том, что не все еще способны вербализировать это устремление), конкуренцию и соперничество и не ориентирована на ценности, связанные с "улучшением", реформированием этого несовершенного мира, афиляционно-аллоцентрические ценности становятся массовой ценностью. Не осознавая ценностной оппозиции между независимостью и общностью, молодежь стремится к уважению чужой независимости, но одновременно создает бесконфликтные условия, удовлетворяющие ее собственные потребности в афиляции.
3. Нельзя исключить, что первому поколению белорусской молодежи периода системной трансформации удастся создать новый тип межличностных отношений, при котором будут реализованы две оппозиционные, но очень важные для этого поколения ценности-потребности, ставшие его "визитной карточкой".

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Świda-Ziemba H. Obraz świata i bycia w świecie Warszawa 2000, s.393.
2. Bratkowski P. Stary hipis patrzy na ludzi sukcesu – комментарий к интервью "Ta dzisiejsza młodzież" z H. Świdą-Ziębą roz. G.Sieczkowski . - Magazyn Gazety wyborczej n. 46, 1998 r., s.14.

УДК 398

***Малашук І.М.***

# КАНЦЭПТ САЛЯРНАСЦІ Ў СЯМЕЙНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Надзвычай багатым матэрыялам для вывучэння духоўнай спадчыны нашага народа з´яўляецца і сямейна-бытавая абраднасць у спалучэнні з адпаведнымі ёй песеннымі творамі. На працягу шматлікіх стагоддзяў адбывалася фарміраванне і захоўванне духоўнага багацця беларускага народа, якое складала аснову яго жыцця. А ў агульным комплексе гэтай духоўнасці першае месца займалі тыя асаблівасці і рысы, ад якіх залежалі, паводле народнага ўяўлення, жыццё і шчасце. Ураджай хлеба і працяг рода – асноўныя ўмовы матэрыяльнага і духоўнага жыцця чалавека. Земляробчая міфалогія і абраднасць і сямейная міфалогія і абраднасць былі таму для працаўніка-беларуса вельмі важнымі, непарушна захоўваемымі запаветамі продкаў.

Асабліва вялікае значэнне мае сонца ў вясельным і радзінна-хрэсбінным абрадзе. «Калі нованароджанага першы раз выносілі з хаты, яго як бы паказвалі першы раз усяму Сусвету, усім сусветным сілам і спачатку яго прадстаўлялі менавіта Сонцу» [1, с.83], бо сонца лічылася пачаткам жыцця, і таму вельмі значнай была яго роля пры з'яўленні на свет новага чалавека і стварэнні новай сям'і, новага мікракосму ў Сусвеце. «…вядома, што наогул абрадава – бытавая песенная творчасць у Беларусі была развіта неймаверна моцна і захавалася да нашага часу ў такой колькасці і ў такой старажытнай непарушнасці, як бадай што нідзе ў славянскім свеце… Каляндарна-земляробчыя і сямейна-бытавыя абрады разам з іх паэзіяй займалі ў жыцці беларускага селяніна надзвычай вялікае месца. Сярод жа сямейных абрадаў самым значным і важным ва ўсіх адносінах з´яўляўся, бясспрэчна, абрад уступлення ў шлюб, якім юрыдычна замацоўвалася ўтварэнне новай сям´і – асноўнай ячэйкі сельскай абшчыны і апоры далейшага эканамічнага развіцця сялянскай гаспадаркі» [2, с.6-7].

Аднак шлюб для працоўнага чалавека быў не толькі вялікім актам гаспадарча-грамадскага значэння. Ён быў і найвялікшым асабістым святам, самым высокім і ўрачыстым момантам, які магло падараваць жыццё. Вяселле давала магчымасць простаму чалавеку выказаць у песнях не толькі пажаданні здароўя, багацця і шчаслівай долі маладым, але і сказаць шмат чаго іншага, што складала яго погляд на свет і жыццё, на прыроду і людзей. Паколькі «…абрады (у тым ліку і сямейныя – І.М), выпрацаваныя стагоддзямі, несумненны астатак язычніцкага жыцця» [3, с.4], то ў іх архетып сонца прасочваецца даволі выразна і сустракаецца ў многіх вуснапаэтычных жанрах.

Водгукі вельмі старажытнай анімістычнай вобразнасці данеслі да нас у прыгожых паэтычных увасабленнях песні аб благаслаўленні і шлюбе сонца з месяцам: «Благаслаўляўся ясен месяц У свайго краснага соўнышка» [4, с.31]; «Благаславі, божа, сей пасаг. Сцяклося дзве рэчанькі, сышлося дзве пасажанькі. Першы пасаг – ясны месяц, Другі пасаг – ясна сонца…» [4, с.527]. Патрыярхальны чалавек верыў у самыя інтымныя адносіны не толькі з раслінамі і жывёламі, але і з нябеснымі целамі. У песнях, вядома, гэта ўжо толькі мастацкі прыём – адзін са спосабаў фальклорнай ідэалізацыі герояў: «– Маладзенькая дружачка, Чаму ж ты харошая? Ці цябе сонца радзіла, Ці цябе месячык выгадаваў?» [4, с.380]; «Ці не сонца яго радзіла? Ці не месячык яго ўзгадаваў? Ці не зоры яго калыхалі? Ці не звёзды яго трымалі?» [5, с.13]). Таксама ў жывых, антрапамарфічных вобразах падаюцца сонца, месяц і іншыя сілы прыроды ў песнях, якія спявалі маладой па прыездзе ў дом маладога: «Не журыся, дзевачка, Да ў нас табе добра будзе: Да вецер хату мяце, А сонейка пірагі пячэ…» [6, с.31]; «Не плач, малодачка, У нас табе добра будзе: У нас кошкі мыюць ложкі, Галкі мыюць лаўкі. Вецер хату мяце, Месяц дзяжу месіць, Сонейка пірагі пячэ, А дождж пa ваду ідзе» [4, с.81].

Нягледзячы на даволі іранічна-гумарыстычны змест прыгаданых песень, трэба ўвогуле падкрэсліць адметную якасць беларускай вясельнай паэзіі – сцвярджэнне характва сапраўды чалавечых узаемаадносін. Як падкрэслівае Н.Гілевіч, «у вясельных песнях раскрываецца высакародная, чыстая, неразбэшчаная душа чалавека працы. У сукупнасці сваёй гэтыя творы – вялікая і светлая песня Чалавечнасці, песня Каханню і Пяшчоце, песня вечнаму імкненню людзей да шчасця» [2, с.10]. Таму вяселле ўспрымаецца анімізаванай прыродай як вялікае свята, яна разам з чалавекам радуецца і дэманструе

***Малашук І.М.*** *БФ БДЭУ.*
*Беларусь, 213826, г. Бабруйск, вул. Савецкая, 77/ 48.*

свой «узнёслы настрой», з дапамогай незвычайных з´яў, якія часцей за ўсё можна назіраць у паводзінах сонца (яно іграе, купаецца, сцелецца, ідзе калясом і г.д.): «За лесам, лесам сонейка іграе, Малады малойчык коніка сядлае» [4, с.366]; «За гарою сонейка ўзыходзіць, Узыходзячы хораша іграе, Дзяўчынка на пасад сядае» [4, с.511]; «А над лесам сонейка іграе, Там мой браценька коніка сядлае, У яго мамулька пытае: - Куды, мой сынку, паедзеш? – Я ж паеду, мамулька, жаніцца. – Не выбірай, мой сынку, у карагодзе, А выбірай, мой сынку, у агародзе» [7, с.237]; «У панядзелак рана Да сіня мора йграла, Сонейка купалась, Адарачка ўмывалась…» [4, с.331]; «А ў нядзельку рана Сіне мора калыхала… Сонейка да купалася, А Марусенька да воду брала, З сонейкам размаўляла…» [8, с.429-430]; «За гарой сонца сьцеліцца, (Хрысьцінка) з маманькай дзеліцца…» [5, с.147]; «Калясом соўніка, калясом! Абсей, мамухна, нас аўсом» [9, с.371]; «Сонэйко колэсом на гору йдэ, Да девонька к венчанью еде…» [10, с.2]; «По небу сонейко колесом ідзе, Раненько Да брат сестру на посад ведзе…» [11, с.455].

Невыпадкова, што менавіта з сонцам адбываецца параўнанне ўступаючых у шлюб. Гэта робіцца з той мэтай, каб падкрэсліць чысціню іх пачуццяў, важнасць той падзеі, што адбываецца ў іх жыцці, пажаданне шчасця і дабрабыту ад імя выканальнікаў песень: «Адчыні, мамачка, аконца, Вязём нявеху, як слонца…» [4, с.313]; «Ходзіць маладая каля століка, Як яснае сонейка…» [4, с.328]; «Соўнейка – маладая, Маладзічок – маладзенькі…» [12, с.135]; «Паглядзі, маладая, у аконца: Вот твой малады: як сонца!» [4, с.96]; «Маладая дзевачка, Паглядзі ў ваконца…Стаяць хлопцы, як сонца… У цябе ж сядзіць пры боку…» [12, с.111]. Як бачна, вясельныя песні стваралі ідэальныя вобразы маладых, паказвалі іх незвычайную душэўную прыгажосць з дапамогай вобразнанепаўторных параўнанняў, сімвалічных астральных вобразаў, у першую чаргу сонца. Як адзначае Я.Карскі, гэтыя «…сімвалы амаль што ці не самыя старажытныя ў вясельнай абраднасці… У беларускіх вясельных песнях месяц з´яўляецца прадстаўнікоm мужчынскага пачатку – маладога, сонца… - маладой» [9, с.386]. Напэўна, гэта не выпадкова, таму што як і ад сонца на зямлі, так і ад жанчыны ў сям'і залежыць жыццё, працяг будучага роду. Яны з´яўляюцца ўвасабленнем жыццядайнага пачатку, таму, магчыма, можна весці гутарку аб мацярынска-родавай накіраванасці беларускай вясельнай абраднасці. Даволі пераканаўчым прыкладам можа з´яўляцца песня, запісаная В.Дабравольскім:

Узыйшло солнушка да ні абутрыла,
Дунічка плакыті да ня думыла. –
Ой, ужу солнушка пыд абед бьетца,
Ай, наша Дунюшка, как рыка льетца [13, с.40].

Тут назіраецца паралелізм паміж сонцам і маладой, дзеянні і настрой якой суадносяцца са становішчам сонца. «Нявеста (як будучая маці) і жанчына-парадзіха вельмі блізкія сонцу, якое дае жыццё, свет і цяпло. І нявесцін вянок і шлюбны пярсцёнак, (які парадзіха пакідае на руцэ ў час родаў, здымаючы ўсе астатнія ўпрыгожванні: пацеркі, завушніцы і г.д.) прысвячаліся сонцу (мелі круглую форму)… Нявеста раніцай сустракала Сонца неапранутая, з расплеценай касой, кветкамі медуніцы ў руках і прасіла ў Сонца даравацъ ёй памылкі і грахі, блаславіць яе на шчаслівае жыццё, пасляць здаровых дзяцей (часцей трох: двух сыноў і дачку), абавязвалася быць вернай свайму мужу, шанаваць яго бацькоў, быць добрай гаспадыняй, уставаць разам з сонцам, не насіць дзявочага ўбору, пакінуць толькі чырвоную спадніцу (або сарафан) для будучай дачкі…» [1, с.118]. У радках: «Сонца за месяц усё павышэй, Ой, месяц сонцу ды пакланіўся» [4, с.484-485] – прасочваецца перавага жаночага (сонечнага) пачатку над мужчынскім. Сапраўды, магчыма, прыгаданыя вясельныя творы дайшлі да нас з тоўшчы стагоддзяў, з часоў матрыярхальнай родавай абшчыны, калі сонечны культ быў надзвычай распаўсюджаны і табуіраваны. Як адзначае даследчык беларускага арнаменту М. Кацар, «у тканым і вышываным арнаментах вобраз маці сустракаецца ў розных варыянтах: у выглядзе жаночай фігуры, абмежаванай гірляндаю зорак і схематычна вырашанага дрэва жыцця» [14, с.45]. Нярэдка вобраз суправаджаецца сімваламі сонца, месяца, агню, ветру. Гэтым майстрыхі падкрэслівалі раўназначнасць вобразаў.

Таксама сустракаюцца фрагментарныя прыклады параўнанняў сонца з маці і бабуляй: «Сонейка-матушка каля лесу йшло, Бліжэй таго Ганулі каля рэчушкі…» [7, с.504]; «Весело, ясно сонце на небе, Веселей, ясней у ўнучкі бабе на куце…» [15, с.26].

З старажытным салярным культам звязана і ўжыванне вясельнага агню. У першую чаргу яго выкарыстоўвалі пры ўзвядзенні на пасад маладога, які заканчваўся падпальваннем валасоў маладога на ілбе, на патыліцы і каля вушэй. «Валасы падпальваюцца «грамнічнай» свечкай; але ў песні, суправаджаючай абрад, агонь для падпальвання валасоў здабываўся ад «бела каменя», гэта значыць ад крэмня. «Да бейця, да бейця да белы камень, Агню даставайця! Маладога застрыгайця» [3, с.31].

Гэты спосаб здабывання агню – надзвычай архаічны, узыходзячы сваімі каранямі яшчэ да татэмістычнай эпохі. Узнікае пытанне, чаму свечка, якой падпальваюць валасы маладога, называецца «грамнічнай». Тут магчымы розныя меркаванні: або тэрмін «грамнічны» атрыманы ў спадчыну ад першабытнай эпохі, калі існаваў спосаб здабывання агню ад дрэва, запаленага маланкай, або гэты тэрмін патрэбна асацыіраваць са свечкай, асвячонай у царкве на свята «грамніцы», так называўся ў беларускай рэлігійнай тэрміналогіі хрысціянскі дзень стрэчання. Але так як тэрмін «грамніца» па свайму значэнню не мае ніякага дачынення да зместу хрысціянскага свята стрэчання, то мы павінны лічыць, што тэрмін «грамніца» узыходзіць да першабытна – абшчыннай эпохі, калі агонь здабываўся альбо ад крэмня, альбо ад дрэва, паражонага маланкай» [16, с.114]. У хрысціянскую эпоху адбылося напластоўванне рэлігійных вераванняў, аднак і тут язычніцкі салярны культ захаваўся і дайшоў да нас, напрыклад, у выглядзе асацыяцыі свечак з сонцам: « – Не пытайся ў мяне, мамачка, Пытайся ў маіх падружачак, Яны за маімі плячамі стаялі, Глядзелі, як мае свечкі гарэлі. А гарэлі свечачкі, як сонца, А звянчалі Зіначку, як слоўца» [8, с.366]. Таксама дачыненне да салярнага культа мае матыў распляцення касы маладой (нагадаем назву сузор´я Каса Беранікі). Адначасовы зварот да сонца і дзяўчыны з просьбай найхутчэй высушыць расу і акуратна расчасаць касу – пацвярджэнне гэтаму: « – Зыдзі, сонейка, абжані расу, Ой, рана, рана, абжані расу. Устань, дзеванька, расчашы касу, На тваю касу імгліца ўпала» [8, с.421].

Выкарыстанне агню, звязанага паралелізмам з сонцам, у вясельным абрадзе мае даволі старажытнае паходжанне і сустракаецца не толькі ва ўсходніх славян, але і ў іншых народаў свету. Напрыклад, «старажытнаіндыйскі абрад пасаду маладой адбываўся ў яе дома перад шлюбам і часам паўтараўся дома ў маладога пасля шлюбу. Рытуал пасаду дома ў нявесты заключаўся ў тым, што перад ачагом, на якім запальваўся агонь, рассцілалася бычыная шкура чырвонага колеру поўсцю наверх. Адзін з дужых мужчын (з роду маладой?) уносіць маладую на руках, садзіць яе на гэту шкуру пры пажаданнях шчасця і багацця з боку маладога і іншых прысутных, і пакуль яны сядзяць, малады дакранаецца да яе валасоў… Дома ў маладога для пасаду сцелецца такая ж шкура,…рассцілаючы шкуру, малады вымаўляе спецыяльную магічную формулу… запальвае агонь, садзіцца сам на шкуру і садзіць побач маладую, узяўшы яе за руку… у аснове яго (абрада – І.М.) ляжыць культ дамашняга ачага, і пры гэтым абрадзе малады звяртаецца да Агні, бога агню і ўладкаваль-

ніка дамашняга ачага, і просіць Агні аб дараванні новай сям´і шматлікага патомства і ўсялякага багацця, ніспасланага сонцам» [16, с.130].

На Беларусі ж, «набліжаючыся да сядзібы бацькоў мужа, маладыя з мэтай ачышчэння пераязджаюць праз агонь» [9, с.381]. Па сведчанню Е. Раманава, адбываецца гэта так: «Падчас прыбыцця бяседы да варот бацька маладога, сустракаючы маладых з агнём-зублёнкаю, кладзе ў варотах куль саломы і запальвае яго, праз полымя якога пераязджае павозка з маладымі, кублом, пасцельніцай і затым пераязджае ўся бяседа» [11, с.421]. Адна з сваячніц маладога «бярэ масла і змазвае ім валасы, перш маладому, а потым маладой. Затым бярэ іх валасы і, злучыўшы разам, абпальвае вясельнымі свечкамі» [11, с.436].

Адным з галоўных сімвалаў усіх трох сямейна-абрадавых цыклаў з'яўляўся каравай, якім бласлаўлялі нованароджанага і жаніха з нявестай і з якім суправаджалі нябожчыка ў яго апошні шлях. «Святочны хлеб (каравай) быў прысвечаны Сонцу. Каравай выпякаўся той жа самай, як і Сонца, круглай формы. У час вясельных рытуалаў да Сонца звярталіся з просьбай, каб яно блаславіла каравай. Гатовы каравай укладаўся на прыгожы ручнік, яму кланяліся, спявалі песні, звярталіся да яго як да жывой істоты… Пасля жанчыны-каравайніцы неслі каравай на ручніку на ўзгорак і прасілі Сонца блаславіць яго. Каравай на некалькі хвілін пакідалі на ручніку, а самі спускаліся з узгорка. Пасля бласлаўлення каравая Сонцам ён станавіўся свяшчэнным» [1, с.83-84].

Старажытны культ агню-сонца мае месца і пры дзяльбе каравая, аднаго з асноўных атрыбутаў вяселля. Пасля таго, як каравай уносяць у хату, старэйшы дружка бярэ ў руку запасную булку хлеба, выразае з яе верх, у аб´еме ад двух да трох вяршкоў, у якой праразае дзірку і ўстаўляе дзве свечкі і, каб запаліць іх, старэйшы дружка здабывае агонь пры дапамозе крэмня з крэсівам і не інакш, як з аднаго размаху…» [11, с.415]. Патрэбна адзначыць, што і сам каравай, у дадзеным выпадку, з´яўляецца салярным сімвалам. На думку А.Патэбні, «да ліку сімвалаў сонечнага бога патрэбна аднесці і хлеб» [17, с.59].

Па сведчанню М.Нікольскага, пасад маладога «пачынаецца абходам вакол стала, на які пакладзены хлеб (абавязкова падкрэслім, што робіцца гэта «па сонцу» - І.М.): маладога абводзіць тры разы вакол стала яго дружка, узяўшы яго за рушнік, прычым малады кладзе зямныя паклоны прысутнічаючым і хлебу» [16, с.111]. Нават у хмурны дзень каравай расчыняюць у тыя хвіліны, калі сонца выглядае з-за хмары, бо калі рабіць наадварот, то маладых, паводле павер´я, чакаюць у жыцці сумныя дні, поўныя няшчасцяў і шматлікіх клопатаў. Гэты ж матыў выразна прасочваецца і ў каравайных песнях: «Высока сонейка, высока, Занясём каравай далёка Ды й паставім на жыце, Дай, божа, маладзенькім Добра пражыці» [7, с.154]. У якасці пацвярджэння салярных каранёў паходжання вясельнага хлеба Я.Карскі адзначае «круглы выгляд каравая, выяўленне на ім сонца, месяца і зорак, а таксама кругавы рух разам з ім. У песнях пры выпяканні каравая сустракаюцца звароты да месяца і сонца. Усё гэта… пераносіць нас у глыбокую старажытнасць і прымушае бачыць у караваі сімвал абагаўляемых свяціл, а магчыма і прадмет, што прыносіцца ім у ахвяру… Нават ахвяраванне нябесным свяцілам каравая мае адносіны да таго ж, так як ад сонца залежыць жыццё, пладаноснасць і ўвогуле апладненне на зямлі» [9, с.356-357]. У ахвяру прыносіўся не толькі сам каравай, а яшчэ і дадатковы, спецыяльна выпечаны салярны сімвал у выглядзе пеўня ці курыцы. «У многіх месцах у спальным пакоі маладыя ядзяць смажанага пеўня ці курыцу. Тое ж назіралася і ў старажытнай Русі, калі маладым падавалі ў спальню «куря верченое»… Певень і курыца, з аднаго боку, з´яўляюцца сімвалам новай сям´і, а з другога – адлюстроўваюць на сабе сляды старажытных славянскіх ахвяраванняў богу сонца, прадстаўнікам якога быў певень, што абвяшчае аб яго з´яўленні» [9, с.379-380]. Як адзначае І. Казакова, «у беларусаў на першую шлюбную ноч маладым даюць белага пеўня, каб абараняў іх і адводзіў злыя сілы. У паўднёвых славян жаніх на вяселлі абавязкова нёс жывога пеўня» [1, с.78]. Назіраецца нават пэўны паралелізм паміж пеўнем і маладым жаніхом: «Сядзеў пятушок на кані (конь – аздоба на даху хаты – І. М.), Спусьсіў крылійка да зямлі… Сядзеў (Якушка) за сталом, Спусьціў шубаньку с плеч далоў…» [5, с.122]. Абавязковай была на караваі выява пеўня ў адным пераліку з нябеснымі свяціламі: «…і ў Беларусі, і на Украіне ўпрыгожваюць каравай зробленымі з цеста выявамі сонца, месяца і зорак…» [16, с.190], «…шышачкі…- гэта зорачкі і розныя выявы па краях каравайнага хлеба. Паказваюць абавязкова пеўня…» [18, с.55].

Як бачым, салярная сімволіка займае даволі змястоўнае месца ў каравайным абрадзе. Яго значнасць у ходзе вяселля падкрэсліваецца тым, што, паводле перакананняў старажытнага чалавека, гэты рытуальны хлеб выпякаецца ўсімі: Богам, Прачыстай, Месяцам, зоркамі і г.д., а Сонца, якое ласкава называецца «Сонейкам», выконвае самую адказную функцыю – запякае каравай: «Ва саду голля вісяць, Сам бог каравай месіць, Прачыстая ваду носіць, Анёлы муку сыплюць, А панно Мар´я качае, Месяц у печы саджае, Зоранька закладае, сонейка запякае» [4, с.78]. Нават печ, у якой выпякаецца каравай, называецца "краснай": "А нехай жоночкі коровая ізробять, І зробівші, у красную печь усадять!" [19, с.35]. Вядома, што гэты эпітэт даволі часта ўжываецца для характарыстыкі самога сонца: "Выходзіць ясен месяц, А пасля яго красна солнышка…"[16, с.157], і да каравая ён дапасуецца таксама: "…Штобы наш загнет ясен був, Штобы наш коровай красен був…" [11, с.403]. Сонца, печ, каравай характарызуюцца адным і тым жа словам.

Яшчэ ў большай ступені салярнасць каравая падкрэсліваецца залатымі ўпрагожваннямі. Ён мае залатыя "веття": "Да зэлэн явор на дворы, А коровай гібнуть на столы. А у явора веття зэлэнэе, А у коровая золотэе" [18, с.54], яго сажаюць на "золоте": "Короваю, мой раю, С тобою граю, На сребры качаю, На золоте сажаю"[18, с.55] і "качаюць золотымі перстнямі" [18, с.55].

Залаты пярсцёнак – таксама неад´емны атрыбут кожнага вяселля. Ён не пазбаўлены сонечнага пачатку. Як адзначае Я.Карскі, "абмен пярсцёнкамі…вядомы не толькі хрысціянскім народнасцям: яго ведалі старажытныя індусы, рымляне, германцы; у цяперашні час, акрамя славян, ведаюць немцы, французы, італьянцы, латышы… Ясна з сказанага, што абрад з пярсцёнкамі адносіцца да глыбокай старажытнасці… пярсцёнак – сімвал сонца, шлюбнага злучэння сонца з месяцам ці зямлёй" [9, с.345].

Сведчанне гэтаму знаходзім у шэрагу вясельных песень: "Зажурыўса дзецінка ў дорозе, Што не кован его конік у возе. Да зачула тое дзевчінка: Да не журіса, дзецінка. Есьць у мене залатыя персценькі, Будуць тваему коніку подковкі" [20, с.58]; " – Не журытеся, блізкі соседі, Ночкою темненькою: Ой есть у мене золотый перстень, Вон буде мне светіті; Ой есть у мене молод Іванко, Вон буде мне годыты…" [19, с.27].

Зноў-такі, не менш важным атрыбутам вясельнага абраду з´яўляўся вянок. Ён суадносіўся з сонечным золатам і нябеснымі свяціламі: "Пасярод вянка красна сонейка ўзышло, Ясны месяц усю дарожаньку асвяціў" [4, с.260-261]; «… То золатам, то сірабром содзючы, Пысярот вянка красна сонейка ўзыйшло, у патыліцы ясін месяц асьвяціў, А кыла краю дробны звездушкі ўзбліснулі» [5, с.161]; «…Савівала мне веночык мамухна, … То золата, то сірабра садзючы. Сярот вянка яснае ўзор´я садзіла, Штой яна ей дарожаньку сьвяціла…» [21, с.161]. «Абрадавае ўжыванне вянка вельмі старажытнага паходжання: вядомы вянкі ў рымлян, хаця і не толькі вясельныя (а таксама за перамогу, у знак гонару), германцаў і інш. Нават хрысціянская царква прыняла вянок у абраднасць

шлюбаў, што адбылося толькі ў канцы III стагоддзя. Што датычыцца славянскіх народаў, то звычай упрыгожваць маладую вянкамі вядомы ўсюды. Такім чынам, ужыванне вянкоў на вяселлях вядома даўно. Але што ж абазначае вянок? Вельмі можа быць, што першапачаткова ён азначаў сонца ці прамяністы яго німб. У пацверджанне гэтай думкі міфолагі звычайна спасылаюцца на наступную латышскую песню (…у рускім перакладзе):

Дочь солнца вброд переходит море.
Виднеется лишь её веночек:
Подайте лодочку, божьи сыновья,
Спасайте жизнь солнца” [9, с.351-352].

Асобнае месца сярод песень ў вясельным абрадзе адводзілася тым, якія выконваліся ў выпадку смерці бацькоў маладога альбо маладой. Гэта былі “спецыяльныя сумныя галашэнні нявесты-сіраты” [22, с.207], у якіх яна бядуе аб адсутнасці бацькоў на вяселлі, просіць іх “з’явіцца…, блаславіць яе на шлюбнае жыццё, памагаць сваімі малітвамі і заступніцтвам у яе будучым жыцці» [15, с.160]: «Як заехала яснае сонца за хмару, Так прысыпалі родную мамку зямлёю. Выйдзе, выйдзе яснае сонца з-за хмары, Ды не ўстане родная мамка з-пад зямлі» [4, с.202]; «Ой, буду ж, буду ды я бога прасіці: Ой, дай жа, божа, яснага сонца, Раскалі, божа, цісову дошку, Ой, пусці, божа, майго татку ка мне, Няхай дае парадак беднай сіраце» [4, с.198]; «Невясёлы дзень Без яснага сонца, Невясёлы пір Без роднага папкі» [6, с.31]; «Свяці, свяці, сонца, рассушы дошкі, Рассушы дошкі, адпусці ножкі» [4, с.137]; «Ой, сашлі яго, божа, З дожджыкам на зямлю. З дожджыкам на зямлю, з ясным сонейкам у святліцу. Хай ён забачыць сваё дзіцетка…» [4, с.119]. Як бачна, сонца паўстае як сімвал добрай долі і жыцця ўвогуле. Як адзначае К.Кабашнікаў, «тыповым прыёмам для галашэння па бацьку з’яўлялася параўнанне яго з зайшоўшым сонейкам… гэта параўнанне ёсць у галашэнні наўгародцаў па князю Мсціславу, у галашэнні ўладзіміра-валынцаў на пахаванні князя Уладзіміра Васількавіча, у пахавальным слове на смерць Аляксандра Неўскага» [23, с.57]. Існавала павер’е, што нябожчыкаў абавязкова трэба хаваць пасля апоўдня і да заходу, каб заходзячае сонца дапамагло трапіць душам памёршых у іншы свет.

У якасці высновы можам пазначыць, што сямейная абраднасць таксама прасякнута сонечным культам. Нябеснае свяціла паўстае як адвечная крыніца жыцця, пладароддзя, сонечнай энергіі, што дае падставы суаднесці яго з жаночым пачаткам. Ва ўрачыстыя моманты жыцця чалавека-працаўніка сонца радуецца разам з ім, як і ў вялікія святы, паводзіць сябе даволі незвычайна, асабліва ярка праяўляецца гэта ў багатым вясельным абрадзе, дзе салярную аснову маюць каравай, пярсцёнак, вянок, ачышчальны агонь. Менавіта таму сонца займала першае месца ў светапоглядзе старажытнага чалавека.

## СПІСАК ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Казакова І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору) – Мінск: «БОФФ», 1999.
2. Гілевіч Н.С. Лірыка беларускага вяселля / Уклад. і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск: Выш. школа, 1979.
3. Довнар – Запольский М.Ф. Белорусская свадьба и свадебные песни. – Киев, 1888.
4. Вяселле. Песні ў 6 кн. / Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка, рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік. - Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – Кн.2.
5. Шлюбскі А. Матэрыялы для вывучэння быту і мовы Віцебшчыны. – Мінск, 1927 – 1928.
6. Вяселле: Абрад / Уклад К.А. Цвіркі; муз. дадатак З.Я. Мажэйка. - Мінск: Навука і тэхніка, 1978.
7. Вяселле. Песні ў 6 кн. / Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка, рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік. - Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – Кн.1.
8. Вяселле. Песні ў 6 кн. / Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка, рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік. - Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – Кн.3.
9. Карскі Я. Беларусы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001.
10. Довнар – Запольский М.Ф. Песни пинчуков. – Киев, 1895.
11. Романов Е.Р. Белорусский сборник. – Киев: Тип. Малкина, 1887. – Вып. 3.
12. Зянько У. Спадчына маёй маці / Укл. В.Ліцвінка. – Мінск: Маст. літ., 1993.
13. Добровольский В.Н. Смоленский этнографический сборник: В 4ч. – СПб., М., 1891 – 1903. – Зап. по ИРГО по отд. этн. – IXXVII – Ч. 1-4.
14. Кацар М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / Рэд. Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭН, 1996.
15. Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края // Сб. Отделения русского языка и словесности АН. – СПб, 1887 – 1902.– Т. 1 – 3.
16. Никольский Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. – Минск, 1956.
17. Потебня А.А. О некоторых символах в славянской народной поэзии: связи некоторых представлений в языке. О купальских огнях и сродных с ними представлениях. О доле и сродных с нею существах. – 2-е изд. – Харьков, 1914.
18. Довнар – Запольский М.Ф. Мотивы свадебных песен пинчуков. – Гродно, 1893.
19. Крачковский Ю.Ф. Быт западнорусского селянина. – М., 1874.
20. Янчук Н.А. По Минской губернии (Заметки из поездки в 1886 г.) – М., 1889.
21. Шлюбскі А. Гісторыка-этнаграфічныя нататкі. – М., 1928.
22. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А.С. Фядосік, А.С.Емяльянаў, У.М. Сысоў, М.А. Каладзінскі. – Мінск: Бел. навука, 2001.
23. Кабашнікаў К.П. Беларуска-рускія фальклорныя сувязі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988.


УДК 75(476)

***Папко В.М.***

# РАЗВІЦЦЁ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА НА БЕЛАРУСІ І РОЛЯ ДЗЯРЖАВЫ Ў ГЭТЫХ ПРАЦЭСАХ У 1985 – 2000 гг.

У 80-я гг. у беларускім выяўленчым мастацтве адбываюцца значныя змены, абумоўленыя агульным працэсам дэмакратызацыі грамадства. Беларусь уступіла ў перыяд глабальнай трансфармацыі ўсіх сфер жыцця, якая на мастацтве наогул адбілася станоўчым чынам. Жорсткія ўстаноўкі што і як маляваць былі забытыя. Вялікая колькасць інфармацыі аб ма-

***Папко Вольга Мікалаеўна.*** *Асістэнт каф. філасофіі і культуралогіі БГТУ, аспірантка інстытута гісторыі НАН Рэспублікі Беларусь.*